(«Залаты пеўнік», «Снягурка», «Царская нявеста» М.Рымскага-Корсакава), Джыльда, Віялета («Рыгалета», «Травіята» Дж.Вердзі), Разіна («Севільскі цырульнік» Дж.Расіні), Царліна, Сюзанна («Дон Жуан», «Вяселле Фігара» В.А.Моцарта), Мюзэта («Багема» Дж.Пучыні), Мікаэла, Лейла («Кармэн», «Шукальнікі жэмчугу» Ж.Бізэ) і інш.

*І.У.Пілатава.*

**ЗЛАТАГО́РАЎ** (сапр. Гольдберг) Павел Самойлавіч (30.12.1907, г. Сергіеў Пасад Маскоўскай вобл. — 24.9.1969), беларускі і рускі рэжысёр оперы. Засл. артыст Беларусі (1940). Засл. артыст Расіі (1947). Скончыў Цэнтр. тэхнікум тэатр. мастацтва ў Маскве (1931). З 1933 працаваў у Муз. тэатры імя К.С.Станіслаўскага і У.І.Неміровіча-Данчанкі. Адначасова з 1935 у Дзярж. тэатры оперы і балета Беларусі (у 1939—42 гал. рэж.). Сярод пастановак на бел. сцэне: оперы «Рыгалета» Дж.Вердзі (1935), «Тоска» (1937) і «Чыо-Чыо-сан» (1940) Дж.Пучыні, «Міхась Падгорны» Я.Цікоцкага (2-я рэд., 1939), «Яўген Анегін» П.Чайкоўскага (1940) і інш.

**ЗЛЕ́ПАК** у мастацтве, дакладная копія твора скульптуры, прыкладнога і інш. відаў мастацтва аб'ёмнага характару. З. атрымліваюць шляхам зняцця з арыгінала цвёрдай (гіпсавай) або мяккай (васковай, пластылінавай і інш.) формы і заліўкі ў яе гіпсу, сінтэтычнай масы і інш. Выкарыстоўваецца ў музейных экспазіцыях, рэстаўрацыі, у якасці навуч. дапаможніка.

**ЗЛО́ТНІЦТВА**, выраб рэчаў з каштоўных металаў; від *ювелірнага мастацтва.* У Беларусі вядома з часоў жалезнага веку (7 — 6 ст. да н.э. — 5 ст. н.э.). Найб. пашырана як гар. рамяство ў 12 — 18 ст. Бел. майстры-злотнікі валодалі рознымі тэхнікамі апрацоўкі і аздаблення металаў (*ліццё*, коўка, *чаканка, гравіраванне, філігрань*), пераважна серабра (залачэнне, *чарненне, зярненне,* пацірaванне). Выраблялі посуд, упрыгажэнні, абклады кніг і абразоў, крыжы, дарахавальніцы і інш. Шэдэўр З. часоў сярэдневякоўя — *крыж Ефрасінні Полацкай* работы Лазара Богшы (1161). У 16 — 17 ст. майстэрні і цэхі злотнікаў дзейнічалі ў Віцебску, Брэсце, Гродне, Кобрыне, Магілёве, Нясвіжы, Слуцку і інш. У 2-й пал. 17 ст. больш за 50 бел. майстроў з Віцебска, Полацка, Магілёва (у т.л. П.Заборскі, В.Карпаў, М.Логінаў, Я.Магілёвец і інш.) працавалі ў Залатой, Сярэбранай, Аружэйнай палатах Маскоўскага Крамля, дзе выраблялі посуд, зброю, абклады кніг і абразоў. Пашырэнне механічнай апрацоўкі металаў у сярэдзіне 19 ст. прывяло З. да заняпаду. *Я.М.Сахута.*



*Да арт. Злотніцтва. Фрагмент пушкі (цыборыум). Канец 16 ст.*

**ЗЛО́ТЫ** (польск. zloty), манетны намінал і лікава-грашовы тэрмін у Беларусі ў 14—19 ст. 1) Назва дуката ў 14—15 ст. і парытэтнай яму сумы ў 30 польск. грошаў у Польшчы і ВКЛ. 2) Грашова-лікавая адзінка Польшчы, ВКЛ, Рэчы Паспалітай у 16—18 ст. У сувязі з патанненнем серабра з пач. 16 ст. рэальны і лікавы сэнс З. адасабляюцца: па-ранейшаму азначае 30-грашовую суму, а для абазначэння дуката ўжываецца тэрмін З. чырвоны. Рэформа 1526—28 увяла ў Польшчы грашовую сістэму, якая грунтавалася на лікавым З.=30 грошам=60 паўгрошам=90 шэлегам=540 дэнарыям. 3) У бел. пісьмовых крыніцах у 2-й пал. 18 ст. ўпамінаецца З. рус. — назва рас. манеты, парытэтнай 30 грошам, г.зн. польск. З. 4) Сярэбраная манета 16 — сярэдзіны 19 ст., парытэтная 30 грошам польск., якую ў 1564—65 у выглядзе талера з пазначэннем наміналу «XXX» выпускаў Віленскі манетны двор, у 1663—66 — манетныя двары Рэчы Паспалітай і Саксоніі. Рэгулярная эмісія З. пачалася ў 1766. У 1794 па ініцыятыве Т.Касцюшкі выпушчаны папяровыя асігнацыі З. рознай вартасці. У час паўстання 1830—31 чаканіліся т. зв. мяцежныя манеты ў 1, 2, 5 З. 5) Папулярная ў Беларусі, Украіне і Польшчы ў канцы 19 — пач. 20 ст. назва рас. манеты вартасцю 15 капеек. 6) Грашовая адзінка Польшчы. У 1924—39 З. абарачаўся на тэр. Зах. Беларусі.

**ЗЛУ́ЧНІК**, лексіка-граматычны клас слоў, якія афармляюць сувязь паміж словаформамі ў саставе простага сказа, паміж часткамі складанага сказа, а таксама ўнутрытэкставыя сувязі ў межах складанага сінтаксічнага цэлага. Паводле марфемнай структуры З. бываюць невытворныя, якія не падзяляюцца на марфемы і не суадносяцца са знамянальнымі часцінамі мовы («а», «ці», «каб»), і вытворныя (словаўтваральна звязаны са знамянальнымі часцінамі мовы). Сярод вытворных З. адрозніваюць простыя («нібыта», «калі», «таму») і складаныя («з-за таго што», «тады як», «для таго каб»). У залежнасці ад спосабу выкарыстання З. дзеляцца на адзіночныя, паўторныя («і ... і», «або ... або», «ці ... ці») і парныя («не столькі ... колькі», «калі ... то», «не толькі ... але і»). Па функцыянальным значэнні прынята размяжоўваць 2 асн. класы З., да якіх адносяцца спалучальныя («і», «ды», «таксама»), супраціўныя («а», «аднак», «затое»), раз-

меркавальныя («ці ... ці», «то ... то», «або ... або»), а таксама падпарадкавальныя З. прычыны («таму што», «бо», «з прычыны таго што»), часу («калі», «пакуль», «як толькі»), выніку («так што», «у выніку чаго», «дык»), уступкі («хаця», «нягледзячы на», «няхай») і інш.

*Літ.:* Граматыка беларускай мовы. Т. 1. Мінск, 1962; Шуба П.П. Сучасная беларуская мова. Марфаналогія. Марфалогія. Мінск, 1987; Кароткая граматыка беларускай мовы. Ч. 1. Мінск, 2007.

*Д.В.Дзятко.*